*Л.М.РАГАЧОВА*
*В.А.ГРАЧОВА*

# НАКІРАВАНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ КУЛЬТУРОЛАГАЎ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Адукацыйны працэс з часоў Сакрата, Платона, Арыстоцеля разглядаецца як неад'емная частка і ўмова развіцця чалавечага грамадства, як яго цывілізацыйны фактар. Якасць ажыццяўлення працэсаў навучання і выхавання падрастаючага пакалення вызначае як перспектывы развіцця соцыуму ўвогуле, так і эфектыўнасць жыццёвай стратэгіі кожнага з яго членаў. Аднак сучасны аналіз прыярытэтаў, якія склаліся ў сферы адукацыі ў нашай краіне ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст., яскрава сведчыць аб дысбалансе ў вырашэнні гэтай двухадзінай задачы, аб страце каштоўнасці чалавека, яго індывідуальнасці як фундаменце творчага стваральнага працэсу. Таму зусім заканамерна, што ў законе "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь" важнейшай мэтай адукацыі вызначаецца "задавальненне патрэбнасцей асобы ў інтэлектуальным, культурным, маральным, фізічным развіцці... у развіцці яе інтэлектуальна-творчага патэнцыялу".

Такая накіраванасць адукацыйнай сістэмы абумоўлена тым, што чалавечай дзейнасці спрадвечна ўласцівы творчы характар: чалавек у сваім індывідуальным жыцці выступае як суб'ект творчасці, які стварае навакольны свет і ўсведамляе сваё месца ў ім. Асоба, такім чынам, выступае і стваральнікам матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Менавіта ў творчай дзейнасці выяўляецца і зберагаецца індывідуальнасць асобы, выкрываецца разнастайнасць яе сацыяльных роляў і функцый. Ад таго, як развіты крэатыўны патэнцыял падрастаючых пакаленняў, залежаць прагрэс грамадства, тэмпы яго развіцця і, што асабліва важна, перспектывы выхаду нашага грамадства з крызіснага стану. Таму пошук шляхоў і сродкаў развіцця творчай асобы з'яўляецца найважнейшым кірункам у тэарэтычных і практычных даследаваннях сучаснай педагагічнай навукі.

Рэалізацыя сучаснай адукацыйнай парадыгмы патрабуе іншых падыходаў да падрыхтоўкі педагагічнага саставу. Педагогі павінны валодаць высокім прафесіяналізмам і творчым патэнцыялам, быць адкрытымі і для ўспрымання новых гуманістычных формаў арганізацыі выхавання і адукацыі падрастаючых пакаленняў, імкнуцца да пераўтварэння кожнага ўдзельніка сацыякультурнага працэсу з аб'екта, транслятара, абмежаванага адміністрацыйна-ідэалагічнымі ўстановамі зместу адукацыі, у актыўнага творцу новых культурных каштоўнасцей. Аб'ектыўным пацвярджэннем неабходнасці такога акцэнту ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці выступаюць рэальныя сацыяльна-эканамічныя адносіны сучаснага грамадства, якім уласцівы высокі ўзровень канкурэнцыі ва ўсіх сферах жыцця-дзейнасці асобы. Дапамагчы чалавеку знайсці сваё месца ў зменлівым свеце, вызначыць сваю "меру жыцця", навучыць яго творча ўспрымаць эвалюцыйныя працэсы і выкарыстоўваць іх для самарэалізацыі – вышэйшая задача сучаснай гуманістычнай педагогікі.

Вялікія магчымасці па фарміраванні ў асобы неабходных для сучаснай грамадскай сітуацыі якасцей утрымлівае сацыякультурная сфера. Яе шматгранная палітра сродкаў уздзеяння на волю, свядомасць і эмацыянальную культуру асобы стварае спрыяльныя ўмовы для актыўнага выкарыстання ўстаноў вольнага часу ў фарміраванні жыццёвага самавызначэння кожнага чалавека.

Адзначанае робіць неабходным пошук шляхоў і сродкаў удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы культуры і мастацтва. Важнейшая мэта дзейнасці культуролага — духоўнае ўзбагачэнне асобы праз спасціжэнне ёю лепшых твораў мастацтва, усёй культурнай спадчыны. Эфектыўнасць далучэння асобы да гэтай скарбніцы чалавецтва знаходзіцца ў залежнасці ад навукова абгрунтаванага выбару зместу, метадаў, сродкаў уздзеяння мастацтва на духоўны патэнцыял чалавека, што па сутнасці з'яўляецца педагагічнай дзейнасцю. Таму падрыхтоўка спецыялістаў-культуролагаў павінна ўключаць як дысцыпліны гуманітарна-культуралагічнага цыкла, дысцыпліны спецыяльнай падрыхтоўкі, так і блок псіхолага-педагагічных навук. У адпаведнасці з сучаснымі адукацыйнымі стандартамі апошні блок прадугледжвае вывучэнне спектра псіхалагічных дысцыплін, фарміраванне педагагічнага мыслення, засваенне методыкі выкладання спецдысцыплін і педагагічную практыку, што дазваляе выпускнікам вышэйшых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальных устаноў культуры ажыццяўляць выхаваўча-адукацыйны працэс ва ўстановах па арганізацыі вольнага часу на аснове асобасна-дзейнаснага падыходу да чалавека з улікам яго анта- і сацыягенезу. З пункту гледжання сучасных метадалагічных палажэнняў аб падрыхтоўцы спецыялістаў педагагічнага профілю, глыбокае ўзаемадзеянне ўсіх трох блокаў забяспечвае базу для цэласнага фарміравання спецыяліста, пераўтварэння яго з выканаўцы ў педагога-творцу, які валодае здольнасцямі не толькі ўлічваць запатрабаванні грамадства, але і асабістыя здольнасці і інтарэсы сваіх навучэнцаў. Рэалізацыя адзначаных вышэй стандартаў адукацыі патрабуе перагляду і ўдасканалення зместу педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў-культуролагаў, галоўным чынам у частцы вывучэння методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і арганізацыі педагагічнай практыкі.

Неабходна адзначыць, што і раней многія выпускнікі вучэбных устаноў культуры пачыналі сваю працоўную дзейнасць у якасці кіраўнікоў гурткоў, студый і нават выкладчыкаў спецпрадметаў у школах і класах з паглыбленым вывучэннем прадметаў эстэтычнага цыкла. Аднак неабходнасць узбраення ўсіх выпускнікоў не толькі трывалымі педагагічнымі ведамі, але і неабходнымі прафесійнымі ўменнямі і навыкамі ставіць перад сістэмай педагагічнай падрыхтоўкі якасна новыя задачы. Патрэбна стварыць дынамічную мадэль педагога-культуролага, якая можа быць прыстасавана да розных кірункаў яго прафесійнай педагагічнай дзейнасці: арганізацыя мастацкай адукацыі розных узроўняў і мэт у сістэмах міністэрстваў адукацыі і культуры; забеспячэнне дадатковай адукацыі, ажыццяўляемай установамі культуры; арганізацыя навукова-даследчай і праектыўнай дзейнасці ў галіне адукацыі і эстэтычнага выхавання і інш.

Для каардынацыі намаганняў спецыялізаваных творчых кафедраў і кафедры псіхалогіі і педагогікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры па падрыхтоўцы студэнтаў да педагагічнай дзейнасці намі быў распрацаваны прыкладны тэматычны план вучэбнага курса “Методыка выкладання спецдысцыплін”. Мэта яго — дапамагчы выкладчыкам методыкі суаднесці выкладанне прадмета з сучаснымі педагагічнымі патрабаваннямі. Асноўнымі нарматыўнымі дакументамі, якія змяшчаюць гэтыя патрабаванні, з’яўляюцца дзяржаўныя стандарты гуманітарнай адукацыі. Яны прадугледжваюць засваенне студэнтамі БДУ культуры тэарэтычных і практычных ведаў, уменняў і навыкаў па арганізацыі навучання асновам мастацка-творчай дзейнасці. Курс методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін дае магчымасць для сістэматызацыі і адаптацыі тэарэтычных ведаў, асэнсавання педагагічнага вопыту. Тэмы, якія ўключаны ў курс, утрымліваюць неабходны матэрыял для авалодання будучымі педагогамі сродкамі іх прафесійнага самавыяўлення і самаразвіцця. Асобнае месца ў працэсе выкладання дысцыпліны надаецца метадам навучання і выхавання розных катэгорый дзяцей і дарослых у залежнасці ад псіхалагічнага развіцця, падрыхтаванасці і адоранасці.

Логіка падрыхтоўкі студэнтаў да педагагічнай дзейнасці патрабуе пэўнай паслядоўнасці ў выкладанні спецыяльных прадметаў псіхолага-педагагічнага цыкла. Так, курс методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін павінен абавязкова папярэджваць педагагічную практыку і быць звязаны з яе зместам. Мэтазгодным з’яўляецца таксама сумеснае кіраванне педагагічнай практыкай студэнтаў выкладчыкамі методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і супрацоўнікамі кафедры псіхалогіі і педагогікі. Акрамя таго, на наш погляд, для студэнтаў універсітэта культуры, якія атрымліваюць педагагічную кваліфікацыю, неабходны курс "Псіхолага-педагагічныя асновы эстэтычнага выхавання", таму што ён інтэгруе веды па ўсім блоку псіхолага-педагагічных дысцыплін і раскрывае механізмы эстэтычнага развіцця асобы сродкамі мастацтва.

Улічваючы вышэйадзначанае, можна канстатаваць, што важнейшымі задачамі курса “Методыка выкладання спецдысцыплін” з’яўляюцца:

— узбраенне студэнтаў ведамі аб асноўных заканамернасцях вучэбнага працэсу ў адпаведных кірунках мастацка-творчай дзейнасці (з улікам спецыялізацыі);

— фарміраванне ў студэнтаў уменняў аналізаваць, канструяваць і ажыццяўляць на практыцы працэс мастацкай адукацыі і выхавання ў рамках выбранага віду мастацтва;

— фарміраванне навыкаў вызначэння зместу вучэбных заняткаў, а таксама формаў і метадаў яго рэалізацыі ў залежнасці ад ўмоў педагагічнага працэсу;

— развіццё педагагічнага мыслення студэнтаў, фарміраванне ў іх гуманістычнай накіраванасці.

РЭПОЗІТОРІЙ БГУКИ

У адпаведнасці з указанымі задачамі курс змяшчае лекцыйны блок аб'ёмам 16 гадзін. Студэнты атрымліваюць веды аб узнікненні і ўдасканаленні вывучаемага прадмета як самастойнай сферы педагагічнай дзейнасці, вядучых псіхафізіялагічных механізмах уздзеяння на асобу мастацка-творчай дзейнасці, своеасаблівасці рэалізацыі агульнадыдактычных прынцыпаў і метадаў у межах вывучаемага віду мастацкай творчасці.

На семінарскіх і практычных занятках (10 гадзін) навучэнцы засвойваюць метады канструявання, метадычнага аснашчэння і аналізу выкладання спецдысцыплін.

Курс таксама прадугледжвае індывідуальныя заняткі (па адной гадзіне ў семестр на кожнага студэнта), у працэсе якіх педагог правярае і ацэньвае створаныя студэнтамі метадычныя распрацоўкі вучэбных заняткаў, дапамагае вызначыць формы і метады выхаваўчай работы з вучнямі.

Важным элементам прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў у працэсе вывучэння методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін з'яўляецца блок самастойнай работы (індывідуальныя заняткі), які дазваляе ператварыць студэнтаў з аб'екта працэсу навучання ў суб'ект педагагічнай дзейнасці. Акрамя таго, дадзены блок заняткаў дае падставы для індывідуалізацыі адукацыйнай дзейнасці, якая звязана з самастойным выбарам формаў і метадаў правядзення заняткаў. У працэсе вывучэння прадмета кожны студэнт абавязаны распрацаваць комплекс вучэбных заняткаў у рэчышчы атрымліваемай педагагічнай спецыяльнасці. Гэтыя распрацоўкі ўсебакова абмяркоўваюцца на семінарскіх і індывідуальных занятках, а потым могуць быць рэалізаваны ў час праходжання педагагічнай практыкі. Метадычныя распрацоўкі павінны ўтрымліваць:

— вызначэнне педагагічных умоў, у якіх будуць праходзіць заняткі;

— вызначэнне мэты і зместу заняткаў па дадзенай тэме з улікам яе месца ў агульнай сістэме заняткаў па прадмеце;

— выдзяленне неабходнага матэрыялу для заняткаў (у суадносінах з іх працягласцю);

— фармуляванне задач заняткаў;

— падбор адэкватных сродкаў навучання;

— распрацоўка методыкі правядзення заняткаў з вылучэннем асноўных кампанентаў урока: паўтарэнне, паведамленне новага матэрыялу, замацаванне атрыманых ведаў і інш.;

— афармленне матэрыялаў заняткаў у форме метадычных распрацовак (з указаннем выкарыстанай літаратуры, неабходнага аснашчэння, хронаметражу).

Як бачна, кожны з элементаў самастойных метадычных распрацовак патрабуе цэласнага асэнсавання навучання і выхавання асобы сродкамі розных відаў мастацтва, пабудовы прагнастычных мадэляў развіцця вучня, глыбокага іх абгрунтавання. Таму абавязковым з'яўляецца правядзенне семінарскіх заняткаў з выкарыстаннем актыўных формаў навучання: дзелавыя гульні, творчыя конкурсы, "мазгавы штурм", круглы стол і інш., што патрабуе ад студэнтаў лагічнай абгрунтаванасці сваёй пазіцыі і творчага падыходу да вырашэння педагагічнай задачы. Як вядома, педагагічная дзейнасць залежыць не толькі ад узроўню авалодання студэнтам прафесійнымі ведамі і метадычнай падрыхтоўкі, але ў значнай ступені і ад сфарміраванасці асобасных якасцей будучых настаўнікаў. Семінарскія заняткі дазваляюць уводзіць у іх структуру элементы асобаснага трэнінгу неабходных для педагагічнай дзейнасці якасцей, што ўзбагачае працэс прафесійнага станаўлення будучага выкладчыка.

Лекцыі, семінары і індывідуальныя заняткі ўзаемазвязаны паміж сабой. У выніку такой цэласнай арганізацыі вывучэння курса "Методыка выкладання спецдысцыплін" ажыццяўляецца самавызначэнне будучага выкладчыка, фарміруюцца індывідуальны стыль работы, самастойная педагагічная пазіцыя, ідзе асэнсаванне свайго месца ў сацыяльнай прасторы.

---

1. *Закон* «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» // Настаўніцкая газета. – 2002. – 3 крас.

2. *Бакланова Н.К.* Психолого-педагогические проблемы целостного процесса подготовки личности специалиста в институтах культуры // Психолого-педагогические проблемы совершенствования учебного процесса и профессиональной подготовки студентов в вузах культуры и искусства : Сб. науч. тр. –Челябинск: Челяб. гос. ин-т культуры, 1987. — С. 27—29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ